*А. У. Ерашэвіч*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск

*A. V. Yerashevich*
Belarusian State Economic University, Minsk

**УДК [94(476)+371.134(476)(091)] «1803-1860»**

# ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА КВАЛІФІКАВАНЫХ ПЕДАГАГІЧНЫХ КАДРАЎ ДЛЯ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ[1] БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯЎ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.: АРГАНІЗАЦЫЙНА-ФІНАНСАВЫЯ АСПЕКТЫ

# PROFESSIONAL TRAINING OF QUALIFIED PEDAGOGICAL PERSONNEL FOR EDUCATIONAL INSTITUTIONS OF THE BELARUSIAN-LITHUANIAN PROVINCES OF THE RUSSIAN EMPIRE IN THE FIRST HALF OF THE 19$^{TH}$ CENTURY: ORGANIZATIONAL AND FINANCIAL ASPECTS

*У артыкуле на аснове выкарыстання апублікаваных заканадаўчых актаў адукацыйнага ведамства і архіўных дакументаў разгледжаны арганізацыйна-фінансавыя перадумовы забеспячэння працэсу прафесійнай падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў для гімназій, дваранскіх, павятовых і прыходскіх вучылішч Міністэрства народнай асветы ў беларуска-літоўскіх губернях у першай палове XIX ст. Цэнтрамі спецыяльнай педагагічнай адукацыі з мэтай падрыхтоўкі настаўнікаў для навучальных устаноў Віленскай і Беларускай навучальных акруг былі педагагічны інстытут пры Віленскім універсітэце і настаўніцкая семінарыя пры губернскай гімназіі ў Віцебску (1834–1839). Асноўныя выкладчыцкія кадры для навучальных устаноў беларуска-літоўскіх губерняў у 1832–1850-я гг. рыхтаваліся ў Галоўным педагагічным інстытуце ў Пецярбургу – адзінай спецыяльнай вышэйшай навучальнай установе па падрыхтоўцы педагогаў у Расійскай імперыі зыходу прыгонніцкай эпохі.*

*Ключавыя словы: прафесійная падрыхтоўка; педагагічныя кадры; беларуска-літоўскія губерні; Расійская імперыя; фінансаванне; настаўніцкія семінарыі; Галоўны педагагічны інстытут.*

*The article, based on the use of published legislative acts of the educational department and archival documents, examines the organizational and financial prerequisites for providing the process of teacher training for gymnasiums, noble, district and parish schools of the Ministry of Public Education in the Belarusian-Lithuanian provinces in the first half of the 19th century. The Pedagogical Institute at Vilna University and the Teachers' seminary at the Vitebsk provincial*

[1] Улічваючы тое, што ў беларуска-літоўскіх губернях Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст. функцыянавалі розныя тыпы адукацыйных устаноў, у артыкуле разгледжаны толькі арганізацыя і фінансавае забеспячэнне працэсу падрыхтоўкі настаўнікаў для дзяржаўных, агульнаадукацыйных, свецкіх, грамадзянскіх гарадскіх і мястэчковых пачатковых і сярэдніх навучальных устаноў у падпарадкаванні Міністэрства народнай асветы з 1803 да 1860 г.

*Gymnasium (1834–1839) were the centers of special pedagogical education for the purpose of teacher training for educational institutions of the Vilna and Belarusian educational districts. The main teaching staff for educational institutions of the Belarusian-Lithuanian provinces in the 1832–1850s had being prepared at the Main Pedagogical Institute in St. Petersburg – the only special higher educational institution for teacher training in the Russian Empire at the end of the serfdom era.*

*Key words: teacher training; teaching staff; Belarusian-Lithuanian provinces; Russian Empire; financing; teachers' seminaries; Main Pedagogical Institute.*

У сучасных умовах жыццядзейнасці грамадства ад вызначаных дзяржавай патрабаванняў адносна прынцыпаў, зместу, якасці прафесійнай падрыхтоўкі кваліфікаваных педагагічных кадраў шмат у чым залежыць узровень выкладання ў навучальных установах Беларусі ўсіх тыпаў. Таму абгрунтаванай уяўляецца цікавасць да камплектавання адукацыйным персаналам сярэдніх і пачатковых навучальных установаў беларуска-літоўскіх губерняў ў першай палове XIX ст. Рэтраспектыўны аналіз падрыхтоўкі настаўнікаў для гімназій, дваранскіх, павятовых і прыходскіх вучылішч зыходу прыгонніцкай эпохі дазволіць больш зразумець і асэнсаваць механізм пераемнасці традыцый у працэсе падрыхтоўкі айчынных выкладчыцкіх кадраў.

Аб падрыхтоўцы настаўнікаў для навучальных установаў Літвы ў 1773–1850-я гг. згадваў літоўскі савецкі гісторык адукацыі М. Лукшіене [1, с. 44, 46]. Арганізацыю і дзейнасць Віцебскай настаўніцкай семінарыі – першай на тэрыторыі Беларусі спецыяльнай навучальнай установы, у якой у 1834–1839 гг. рыхтаваліся выкладчыкі для навучальных установаў Беларускай навучальнай акругі – вывучаў беларускі гісторык асветы У. С. Пасэ [2]. Аднак цэласнай карціны фінансавання працэсу падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў для навучальных установаў беларуска-літоўскіх губерняў Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст. у беларускай гістарыяграфіі не створана.

Мэта працы – вызначыць фінансавыя асновы арганізацыі і дзейнасці цэнтраў падрыхтоўкі настаўнікаў для патрэб навучальных установаў беларуска-літоўскіх губерняў Расійскай імперыі ў 1803–1860 гг. Для рэалізацыі мэты былі выкарыстаны найбольш поўна прадстаўленыя ў серыйным выданні зборнікаў Міністэрства народнай асветы апублікаваныя заканадаўчыя акты адукацыйнага ведамства, у якіх размешчаны імператарскія ўказы, зацверджаныя вярхоўнай уладай меркаванні Дзяржаўнага Савета, палажэнні Камітэта міністраў, міністэрскія пастановы, ведамасныя распараджэнні, цыркуляры і прадпісанні [3; 4], з дадаткам архіўных дакументаў і мемуарнага сведчання.

У Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст. адстутнічала цэласная (адзіная) сістэма педагагічнай адукацыі, шматузроўневая прафесійная спецыялізаваная падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў для розных тыпаў навучальных установаў шматлікіх ведамстваў. Не размяжоўваліся розныя віды і формы падрыхтоўкі выкладчыкаў (педагагічныя, псіхалагічныя, прак-

тычныя з фарміраваннем навыкаў). За рэдкім выключэннем, не праводзілася, акрамя практыкі самаўдасканалення ў ведах і навыках і нешматлікіх вучэбных камандзіровак, сістэмнае і планамернае павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў і перападрыхтоўка настаўнікаў у спецыяльных навучальных цэнтрах.

Да таго ж, на патрэбу ў якаснай падрыхтоўцы выкладчыцкіх кадраў, неабходных для стварэння, функцыянавання і развіцця розных тыпаў навучальных установ, значны ўплыў аказвалі наступныя фактары: маладаступнасць адукацыі для асноўнай масы сялянскага насельніцтва; розніца ў формах і спосабах задавальнення прыярытэтных эканамічных, сацыяльных, палітычных, культурных патрабаванняў і інтарэсаў для прадстаўнікоў розных саслоўяў і сацыяльных груп грамадства; барацьба за сферы культурна-адукацыйнага ўплыву паміж свецкімі і духоўнымі навучальнымі ўстановамі ў працэсе секулярызацыі школы; сацыяльна-эканамічныя і сацыякультурныя бар’еры, размежаванні і перашкоды (тэрытарыяльныя, моўныя, этна-канфесійныя, сацыяльна-маёмасныя, нацыянальна-культурныя) паміж горадам і вёскай, саслоўна-сацыяльнымі станамі; уздзеянне на адукацыйна-выхаваўчы працэс ранейшых асветна-адукацыйных традыцый Рэчы Паспалітай, заходнееўрапейскай і рускай школы і інш. Прафесія настаўніка ў першай палове XIX ст. не карысталася аўтарытэтам і не была прэстыжнай у грамадскай свядомасці.

З мэтай падрыхтоўкі педагагічных кадраў настаўнікаў для губернскіх і павятовых вучылішчаў Віленскай навучальнай акругі з 1.09.1803 г. пры Віленскім універсітэце была адкрыта 4-класная настаўніцкая семінарыя, ці педагагічны інстытут [5, стб. 429–435].

Штогод на яе штатнае ўтрыманне павінна было выдаткоўвацца 4500 руб. серабром. У сапраўднасці ж настаўніцкай семінарыі было пералічана ў 1805 г. 3882 руб., у 1806 г. – 4003 руб., у 1807 г. – 2809 руб., у 1808 г. – 2667 руб., у 1810 г. – 3804 руб., у 1811 г. – 3813,81 руб., у 1812 г. – 2967 руб., у 1813 г. – 1464,76 руб., у 1816 г. – 2828 руб., у 1817 г. – 3373 руб., у 1818 г. – 3806,36 руб., у 1819 г. – 3414,65 руб., у 1820 г. – 3308 руб., у 1823 г. – 3977,01 руб. Доля адлічэнняў з расходаў Віленскага ўніверсітэта на ўтрыманне настаўніцкай семінарыі і яе прэфекта была невысокай – ад 1,9 % (1816 г.) да 3,9 % (1823 г.) [6, s. 330–391]. Прэфект настаўніцкай семінарыі атрымліваў 300 руб. серабром.

У 1803 г. у настаўніцкую семінарыю былі прынятыя 13, а ў наступным 1804 г. 12 чал. [7, стб. 137, 402]. У 1804 г. у гэтай вучэльні з 19 навучэнцаў толькі 2 вучыліся на ўласны кошт, а астатнія мелі казённае ўтрыманне ў памеры 150 руб. серабром штогод (кожнаму вучню выдавалі па 150 руб. серабром стыпендыі) [8, с. 125]. У настаўніцкай семінарыі штогод навучалася да 20 асоб, ці 5–8 % усіх віленскіх студэнтаў [9, s. 215]. Будучыя настаўнікі размяшчаліся бясплатна ў будынках былой школы кадэтаў, адноўленай у 1807 г. (утрыманне каштавала 5 тыс. руб. серабром). Штогодны

кошт утрымання семінарыстаў уключаў выдаткі на набыццё харчавання за 90 руб. (па 25 кап. у дзень), адзення за 83 руб., на асвятленне, лекі і інш. у памеры 27,7 руб., на паперу і інш. прыналежнасці коштам у 5,3 руб. [10, s. 299]. Апроч таго, для атрымання ведаў штогод 8 вучняў з Віленскага ўніверсітэта павінны былі адпраўляцца ў Санкт-Пецярбургскі педагагічны інстытут. У 1810 г. на гэтую акцыю было выкарыстана 161 руб., у 1811 г. – 47,67 руб., у 1814 г. – 352 руб.

У 1819 г. пры Віленскім універсітэце была заснавана семінарыя для навучання 20 прыходскіх настаўнікаў і арганістаў [11; 3, т. 1, стб. 1289–1293]. На яе ўтрыманне штогод выдзялялася 3 тыс. руб. з агульнага адукацыйнага фундушу і аднаразова 4 тыс. руб. [3, т. 1, дополнение, с. 30, штаты и приложения, с. 35]. Штогод на ўтрыманне 20 выхаванцаў адлічалася 1725,3 руб. (па 86,265 руб. на вучня) (57,5 %), на заробак наглядчыку семінарыі (адначасова быў настаўнікам), другому настаўніку і арганісту – 725 руб. (24,2 %), на ўтрыманне вучылішнага дома – 522 руб. (17,4 %), на непрадбачаныя выдаткі – 27,7 руб. (0,9 %). На ўтрыманне семінарыі прыходскіх настаўнікаў і арганістаў было выдаткавана ў 1829 г. 2992,61 руб., у 1830 г. – 2956,53 руб., у 1831 г. – 1507,99 руб. серабром пры наяўнасці рэшткі да 1831 г. у памеры 258,32 руб. (ва ўніверсітэцкім казначэйстве знаходзілася 214,78 руб., у гімназічнай казне – 43,54 руб.) [12, арк. 21–23].

Мемуарныя звесткі даводзяць, што кожны навучэнец педагагічнай семінарыі атрымліваў па 168 руб. серабром штогоднага ўтрымання (штомесячна выдавалі па 9 руб. у першыя тры месяцы і па 29 руб. на чацвёрты месяц). Вучні мясціліся ў супольнай кватэры ў мурах касцёла св. Яна на трэцім паверсе пры мінералагічным кабінеце ў чатырох вялікіх залах, карысталіся паслугамі інвалідаў-салдат і лакея. Абеды для 2–3 навучэнцаў дастаўлялі з тракціраў. На сняданак і вячэру падавалі каву, гарбату альбо свежае малако з булкай. Усе патрэбы студэнты аплочвалі са свайго ўтрымання, і нават нешта з грошай заставалася (З. Рэўкоўскі мог аддаваць больш 30 руб. для падтрымкі малодшых сясцёр у пансіянатах).

Педагагічны інстытут меў перарыў у дзейнасці з 1822 да 1.09.1825 г. Пасля чатырох гадоў слухання ўніверсітэцкіх курсаў кожны навучэнец атрымліваў ступень сапраўднага студэнта, кандыдата альбо магістра, а іншыя, якія мелі пэўную ступень, пасля сканчэння педагагічнага інстытута высылаліся настаўнікамі школ і гімназій Віленскай навучальнай акругі. Здольныя выпускнікі працягвалі вучобу ў так званым інстытуце прафесараў Дэрпцкага ўніверсітэта. З мэтай удасканалення ў рускай мове некаторыя асобы на два гады выязджалі ў Пецярбургскі і Маскоўскі ўніверсітэты [13, s. 77–78].

За 27 гадоў існавання настаўніцкай семінарыі ў ёй было падрыхтавана каля 150 настаўнікаў [10, s. 301]. У педагагічнай падрыхтоўцы будучых настаўнікаў актыўны ўдзел прымалі манахі, і свецкая адукацыя яшчэ не была канчаткова адзелена ад рэлігійнай. Выпускнікі педагагічнага інстытута былі

абавязаны адпрацаваць на пасадзе без права выбару навучальнай установы не менш 6 гадоў.

Пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта ў 1832 г. з настаўніцкай семінарыяй пры ім і змене курсу дзяржаўнай адукацыйнай палітыкі ў заходнім краі паўстала праблема камплектавання педагагічнымі кадрамі зноў рэарганізаваных навучальных устаноў, асабліва ў зноў створанай Беларускай навучальнай акрузе, якая не мела свайго цэнтра вышэйшай адукацыі. Прафесійная падрыхтоўка кваліфікаваных педагагічных кадраў была неабходнай умовай для замяшчэння штатных настаўніцкіх вакансій і размеркавання на службу казённых выхаванцаў.

Адсутнасць у беларуска-літоўскім краі шматпрофільнай вышэйшай навучальнай установы пасля скасавання Віленскага ўніверсітэта падвялі адукацыйнае кіраўніцтва да думкі, да ўладкавання Беларускага ліцэя, аб заснаванні ў Беларускай навучальнай акрузе семінарыі для падрыхтоўкі прыходскіх настаўнікаў, якія б дастаткова ведалі рускую мову і маглі б заняць выкладчыцкія пасады ў адкрываемых замест духоўных свецкіх вучылішчах. 4.11.1833 г. выйшла міністэрскае распараджэнне аб адкрыцці настаўніцкай семінарыі ў Віцебску і свецкіх прыходскіх вучылішч у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях. Па ўзору былой Віленскай настаўніцкай семінарыі 4-гадавы курс навучання да 30 чал. забяспечваўся грашовым утрыманнем у 3000 руб. з дадаткам 300 руб. на наём і ўтрыманне дома, на выдачу зарплат (грашовай дапамогі) упраўляючаму, гувернеру і настаўнікам, разам 3300 руб. серабром штогод з даходаў маёнткаў скасаваных рымска-каталіцкіх манастыроў [14, ч. 1, № 2, с. CXXXII–CXXXIII; 12, арк. 14–14 адв., 17–17 адв.; 4, т. 1, стб. 876–878]. Семінарыя для падрыхтоўкі прыходскіх настаўнікаў была адкрыта ў Віцебску пры губернскай гімназіі 6.08.1834 г. [15, ч. 6, № 4, с. CI]. (па іншых больш верагодных звестках пачала працу 6.09.1834 г.) [14, ч. 4, с. 433]. Пры адкрыцці семінарыі ў яе былі прыняты 28 выхаванцаў на поўнае ўтрыманне і 23 кандыдаты з даваннем кожнаму па 5 руб. серабром у месяц грашовай дапамогі [16, с. 64].

Кіраўніком семінарыі прыходскіх настаўнікаў пры Віцебскай гімназіі быў упраўляючы ланкастэрскімі вучылішчамі Беларускай навучальнай акругі Аглоблін, начальнік Віцебскага ланкастарскага вучылішча Вінаградаў і настаўнік-наглядчык. 4-класная Віцебская настаўніцкая семінарыя размяшчалася ў мураваным найманым у стацкага саветніка Пoбентала за 1500 руб. штогод 2-х павярховым доме, мела ў складзе адміністрацыйна-вучэбнага персанала ўпраўляючага і 3 настаўнікаў, выплаты жалавання якім ажыццяўляліся з гарадскіх даходаў.

Для грашовага ўтрымання 7 асоб (упраўляючага, наглядчыка, 2 настаўнікаў, 3 служыцелей) было асігнавана да выдачы прыкладна 851 руб. серабром. Забеспячэнне 30 выхаванцаў адзеннем і харчаваннем каштавала штогод 3295,45 руб., на набыццё мэблі і посуду было выдзелена 1014,3 руб. Такім чынам, з 5160,75 руб. агульнай сумы на забеспячэнне навучэнцаў

Віцебскай настаўніцкай семінарыі пайшло 63,9 %, на ўладкаванне памяшканняў было вылучана 19,6 %, на заробкі персанала было адлічана 16,5 %. Да 1.11.1834 г. было сапраўды выдаткавана на выдачу жалавання, на адзенне, размяшчэнне і інш. 3445,68 руб. (66,8 %). Даныя каштарысу на 1839 г. сведчаць, што са штатнай сумы ў 3300 руб. серабром на ўтрыманне наглядчыку і настаўніку рускай мовы было адпушчана 200 руб., настаўніку малявання – 150 руб., музыкі і спеваў – 250 руб., 3 служыцелям, кухарцы і 2 прачкам – 203 руб., на бялізну – 211,6 руб., на адзенне – 420 руб., на абутак – 782,63 руб., на патрэбы размяшчэння – 566,52 руб., на розныя выдаткі – 140,48 руб., на вучэбныя патрэбы – 156,81 руб., разам 3299,52 руб. пры рэштцы ў 1051,06 руб. серабром [12, арк. 44–49 адв., 132, 302–306]. Такім чынам, 3 выкладчыкам паступала толькі 18,2 % сумы, а астатнія грашовыя сродкі выкарыстоўваліся пераважана для задавальнення розных гаспадарчых патрэб.

Прыём выхаванцаў у педагагічную семінарыю ў Віцебску з прадстаўнікоў вольных станаў (дваран, мяшчан, обер-афіцэраў, праваслаўных царкоўнаслужыцелей) праходзіў марудна. У міністэрскім распараджэнні ад 15.04.1836 г. гаварылася аб наборы ў Віцебскую семінарыю прыходскіх настаўнікаў пераважна асоб з папярэдняй адукацыяй для гадзічнага курса навучання ў ёй з мэтай хуткай падрыхтоўкі настаўнікаў [4, т. 2, стб. 112]. Апошні набор выхаванцаў быў разлічаны на 3-гадавы курс навучання [4, т. 2, стб. 416]. У вучобе перавага аддавалася паскоранаму вывучэнню семінарыстамі рускай мовы, расійскай геаграфіі, гісторыі, арыфметыкі, ланкастарскай методыцы ўзаемнага навучання.

Паводле прапановы памочніка папячыцеля Беларускай навучальнай акругі Э. А. Грубера міністр народнай асветы С. С. Увараў прызнаў бескарысным далейшае існаванне Віцебскай семінарыі прыходскіх настаўнікаў. Міністэрскае распараджэнне ад 9.09.1839 г. засведчыла факт яе закрыцця і пераводу адпускаемай дагэтуль сумы на заснаванне і ўтрыманне новых прыходскіх вучылішч [4, т. 2, стб. 416–424]. Галоўным матывам ліквідацыі настаўніцкай семінарыі ў Віцебску было тое, што адстутнічалі грашовыя сродкі, неабходныя для заснавання новых прыходскіх вучылішч і ператварэння старых рымска-каталіцкіх школ. Значныя фінансавыя сродкі ўтрымання самой настаўніцкай семінарыі (аплата найму памяшкання, гаспадарчыя выдаткі ўладкавання, набыццё кніг, часопісаў і вучэбных дапаможнікаў, выдача жалавання настаўнікам і інш.) не былі апраўданы з пункту гледжання ўтрымання малой колькасці навучэнцаў, з прычыны малалікасці адкрываемых прыходскіх вучылішч. Па сутнасці Віцебская настаўніцкая семінарыя пераўтварылася ў канвікт пры губернскай гімназіі, а яе выхаванцы не атрымлівалі спецыяльных ведаў, акрамя таго, што спасцігалі асновы ланкастарскага метаду ўзаемнага навучання пры Віцебскім прыходскім вучылішчы, а некаторыя з іх вучыліся музыцы і спевам. Агульную падрыхтоўку настаўнікаў на рускай мове для прыходскіх

вучылішч за кошт шматлікай і беднай шляхты маглі б забяспечыць гімназіі і павятовыя дваранскія вучылішчы [4, т. 2, стб. 419]. Спасылаліся на вопыт падрыхтоўкі педагагічных кадраў і ў Віленскай семінарыі з 1819 па 1831 г., амаль усе выхаванцы якой альбо пераходзілі ва ўніверсітэт, ці ў іншыя званні, і не займалі пасады прыходскіх настаўнікаў, у тым ліку і таму, што не выконваліся ўмовы заключанага ў 1829 г. канкардата паміж Віленскім універсітэтам і віленскім епіскапам аб заснаванні ў Віленскай епархіі на кошт духавенства 265 прыходкіх вучылішч [4, т. 2, стб. 420–421]. Да таго ж, у Галоўным педагагічным інстытуце ў Санкт-Пецярбургу стваралася асобнае аддзяленне для падрыхтоўкі настаўнікаў павятовых і прыходскіх вучылішч. У сапраўднасці, 11 выпускнікоў Віцебскай настаўніцкай семінарыі засталіся без вакантных настаўніцкіх месцаў [4, т. 2, стб. 417, 421]. Было вырашана чатырох яе выхаванцаў пакінуць у Віцебскай гімназіі для сканчэння курса з дапамогай стыпендыяльных сум з наступным накіраваннем іх на вучобу ва ўніверсітэты, ці прызначыць настаўнікамі павятовых вучылішч, а 7 чал. заставіць пры гімназіі кандыдатамі для паступлення ў прыходскія настаўнікі з утрыманнем па 5 руб. серабром штомесячна з эканамічных сум семінарыі [4, т. 2, стб. 422, 424; 12, арк. 321–321 адв.]. Усяго за час свайго існавання з ліку выхаванцаў і кандыдатаў прыходскай семінарыі ў Віцебску былі выпушчаны 62 настаўнікі для прыходскіх пачатковых школ, павятовых вучылішч і падрыхтоўчых класаў гімназій [4, т. 2, стб. 417–418].

Пасля адмовы ад арганізацыі ліцэя ў Оршы сэканомленыя грашовыя сродкі выдаткоўваліся для падрыхтоўкі патэнцыяльных настаўнікаў у 2 расійскіх сталічных універсітэтах, якіх пасля сканчэння вучобы размяркоўвалі выкладчыкамі ў сярэднія навучальныя ўстановы. Педагагічны савет Віцебскай гімназіі прызначыў выпускнікам, якія навучаліся ва ўніверсітэтах, грашовую дапамогу для набыцця адзення і кніг. Віцебская дырэкцыя вучылішчаў вылучыла да выдачы кожнаму з навучэнцаў па 400 руб. штогод [17, арк. 1–9, 71].

2.10.1838 г. імператар пагадзіўся з заснаваннем, згодна з агульным уставам імператарскіх расійскіх універсітэтаў ад 26.07.1835 г., у Санкт-Пецярбургскім, Маскоўскім, Харкаўскім і Казанскім універсітэтах на кошт дзяржаўнага казначэйства 20 месц для заняцця іх кандыдатамі з ліку выхаванцаў гімназій, настаўнікаў гімназій і павятовых вучылішч Беларускай навучальнай акругі [4, т. 3, стб. 30–31]. Адпаведна вышэйшага загада ад 21.10.1838 г. кожнаму з 20 благанадзейных у палітычных адносінах праваслаўных студэнтаў адлічалася да выдачы па 142,855 руб. серабром штогод з дзяржаўнага казначэйства [4, т. 3, стб. 1021, 1023]. Пасля сканчэння ўніверсітэтаў казённакоштныя студэнты пераводзіліся ў настаўніцкае званне. Паводле асобных распараджэнняў яшчэ залічаліся казённыя пансіянеры розных ведамстваў: да 1840 г. у Пецярбургу праходзілі навучанне да 50 будучых педагогаў, у тым ліку 5 выхаванцаў беларускіх гімназій, якія прызначаліся для выкладчыцкай дзейнасці ў навучальных установах Бела-

рускай навучальнай акругі [18, с. 298]. З прычыны пералічэння Віцебскай і Магілёўскай губерняў з былой Беларускай у Санкт-Пецярбурскую навучальную акругу лепшым выпускнікам Віцебскай і Магілёўскай гімназій 6.09.1850 г. было прызначана ў Санкт-Пецярбургскім універсітэце 2 пастаянныя стыпендыі з 5 месц для пансіянераў былой Беларускай навучальнай акругі [4, т. 3, стб. 30–31]. Казённакоштныя вакансіі былі ліквідаваны, сума іх забеспячэння пераведзена ў Галоўны педагагічны інстытут, які быў скасаваны ў 1858 г. Замест яго пры Пецярбургскім універсітэце былі наладжаны педагагічныя курсы, куды залічаліся кандыдаты пасля сканчэння ўніверсітэцкага курса навук яшчэ на 2 гады з выдачай стыпендый і з залікам потым у сапраўдную службу. У 1860 г. з 30 кандытатаў 8 будучых настаўнікаў прызначаліся для задавальнення патрэбы ў педагагічных кадрах для Віленскай навучальнай акругі [18, с. 299–300]. Цыркуляр міністра народнай асветы ад 13.10.1849 г., пацверджаны 26.06.1852 г. і 23.10.1859 г., дазваляў праваслаўным з ліку пансіянераў Віленскай навучальнай акругі паступаць ва ўніверсітэты [4, т. 3, стб. 1021–1023, 1023–1024]. 23.10.1859 г. выйшла цыркулярная прапанова Міністэрства народнай асветы аб прызначэнні ў Віленскую навучальную акругу на вакантныя настаўніцкія пасады ў вучэбных установах узамен стыпендыятаў з ураджэнцаў заходніх губерняў студэнтаў з прыродных рускіх, акрамя праваслаўных. З-за аддаленасці ад гімназій Віленскай навучальнай акругі Казанскага і Харкаўскага ўніверсітэтаў 13.03.1860 г. адбылося пераразмеркаванне колькасці вакансій для беларускіх стыпендыятаў ва ўніверсітэтах: 9 месцаў стала ў Маскоўскім, 8 у Пецярбургскім і толькі 3 у Харкаўскім універсітэтах [4, т. 3, стб. 1025].

Падрыхтоўка выкладчыкаў для вышэйных навучальных устаноў Расійскай імперыі адбывалася ў адкрытым у 1828 г. прафесарскім інстытуце пры Дэрпцкім універсітэце [3, т. 2, ч. 1, стб. 131–135]. Згодна з зацверджаным імператарам Аляксандрам І меркаваннем Дзяржаўнага Савета ад 14.04.1823 г. з дзяржаўнай казны ў распараджэнне Дэрпцкага ўніверсітэта штогод адлічалася па 1200 руб. серабром для выплаты 6 пастаянных стыпендый кандыдатам (па 200 руб.) з ліку выхаванцаў Літоўскага евангеліцка-рэфармацкага Сінода з мэтай падрыхтоўкі пастараў. Пастановай ад 18.01.1838 г. 2 стыпендыі (400 руб.) былі перададзены ў Пецярбургскі ўніверсітэт для выхавання 2 студэнтаў-пансіянераў Сінода, якія прызначаліся для заняцця настаўніцкіх вакансій у Слуцкай гімназіі. Рэштак ад стыпендыяльнай сумы выдаваўся выпускнікам на пуцявыя выдаткі зваротнага шляху [3, т. 2, ч. 1, стб. 1316–1317].

Першай спецыяльнай асобнай вышэйшай навучальнай установай педагагічнага профілю ў Расійскай імперыі ў дарэформенны час стаў адкрыты на аснове настаўніцкай семінарыі педагагічны інстытут (з 1816 г. Галоўны педагагічны інстытут) у Санкт-Пецярбургу, які працаваў у 1804–1819 гг. і рыхтаваў настаўнікаў гімназій. Пасля ў 1819 г. ён быў перайменаваны ў Пецярбургскі ўніверсітэт. У 1828 г. адноўлены Галоўны педагагічны інстытут

на 100 штатных месцаў у складзе аддзяленняў філасофскага і юрыдычнага (апошняе скасавана ў 1847 г.), фізіка-матэматычных і гістарычна-славесных навук вёў да 1858(59) гг. падрыхтоўку настаўнікаў і прафесараў для навучальных устаноў Міністэрства народнай асветы [3, т. 2, ч. 1, стб. 157–189]. Яго выпускнікі былі абавязаны праслужыць 8 гадоў па ведамству адукацыйнага Міністэрства.

Імператар Мікалай I 9.05.1833 г. дазволіў выкладаць у Галоўным педагагічным інстытуце польскую мову для навучэнцаў, якія пасля выпуску прызначаліся настаўнікамі ў вучылішчы заходніх губерняў, але з-за хуткага распаўсюджвання рускай мовы ў вучылішчах беларускіх губерняў падобная манаршая ласка ўжо 29.01.1836 г. была спынена [3, т. 2, ч. 1, стб. 560–561, 1080–1081]. Пазней 2.11.1850 г. выйшла міністэрскае распараджэнне аб непрыманні ў Галоўны педагагічны інстытут ураджэнцаў заходніх губерняў, акрамя праваслаўных [4, т. 3, стб. 41–42].

За 25 гадоў дзейнасці з Галоўнага педагагічнага інстытута на настаўніцкую службу ў юрысдыкцыі Міністэрства народнай асветы і іншых вучэбных ведамстваў было прызначана 526 чал., у тым ліку 116 (22,1 %) выхаванцаў у навучальныя ўстановы Віленскай і Беларускай навучальных акруг. Па нашых падліках, у 1832–1833, 1835–1837, 1839–1840 гг. адбылося размеркаванне 78 выпускнікоў, у 1841–1843, 1845, 1847–1848, 1850 гг. – 26 выкладчыкаў, у 1851, 1853 гг. – 18 настаўнікаў, разам 122 чал. у навучальныя ўстановы 6 беларуска-літоўскіх губерняў. З гэтай колькасці найбольшая колькасць педагогаў для заняцця настаўніцкіх вакансій у дваранскіх вучылішчах і гімназіях, павятовых і прыходскіх вучылішчах беларуска-літоўскіх зямель прыпадала на 1833 г. (25 чал.) і 1839 г. (18 чал.). Частка будучых настаўнікаў выпускалася пасля сканчэння скарочаных (папярэдніх) курсаў [19, с. 111–135].

Такім чынам, спецыяльная падрыхтоўка настаўнікаў для навучальных устаноў беларуска-літоўскіх зямель у 1803–1860 гг. вялася ў некалькіх адукацыйных цэнтрах, у асноўным у педагагічных аддзяленнях пры ўніверсітэтах. Прафесійнай падрыхтоўкай выкладчыкаў для патрэб сярэдніх і пачатковых навучальных устаноў Віленскай навучальнай акругі займалася створанае пры Віленскім універсітэце, як і пры іншых расійскіх, асобнае арганізацыйна-штатнае адміністрацыйнае структурнае падраздзяленне – настаўніцкая семінарыя ці педагагічны інстытут (1803–1832, з перапынкам у 1822–1825 гг.). Новым цэнтрам забеспячэння і камплектавання педагагічнымі кадрамі прыходскіх вучылішч адкрытай Беларускай навучальнай акругі непрацяглы час была настаўніцкая семінарыя для падрыхтоўкі рускамоўных прыходскіх настаўнікаў пры губернскай гімназіі ў Віцебску (1834–1839), якая працавала нядоўга і з-за неспрыяльных абставін і галоўнае па фінансавых матывах была закрыта.

Пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. настаўнікаў для гімназій, дваранскіх, павятовых і прыходскіх вучылішчаў беларуска-літоўскага

краю па палітычных матывах было вырашана рыхтаваць удалечыні ад раёнаў распаўсюджвання польскіх патрыятычных сепаратысцкіх памкненняў – у Галоўным педагагічным інстытуце ў Пецярбургу, да таго ж адзінай спецыяльнай вышэйшай навучальнай установе па падрыхтоўцы педагогаў у Расійскай імперыі ў 1828–1859 гг., якая выпускала асноўныя выкладчыцкія кадры для навучальных устаноў 6 беларуска-літоўскіх губерняў у 1832–1850-я гг. У гэтую навучальную ўстанову, з дадаткам Маскоўскага, Пецярбургскага, Казанскага, Харкаўскага ўніверсітэтаў, адбываліся мэтавыя наборы студэнтаў казённакоштных (бюджэтных) ці стыпендыятаў з ураджэнцаў заходніх губерняў з наступным іх размеркаваннем і абавязкам прымусовай адпрацоўкі ў навучальных установах беларуска-літоўскіх губерняў. Пасля актыўных выпускаў 1830-х гг. і ўкамплектавання настаўнікамі навучальных устаноў беларуска-літоўскіх зямель тэмпы падрыхтоўкі педагагічных спецыялістаў паменшыліся, тым больш што выкладчыкі займалі пасады працяглы час, і пільная патрэба ў ніх адпала.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Лукшиене, М.* Подготовка учителей в Литве в период кризиса феодализма / М. Лукшиене // Проблемы подготовки учителей в истории развития народного образования в Прибалтике: межведомственный сборник научных трудов / под ред. Л. И. Жукова. – Рига: Латвийский государственный университет им. П. Стучки, 1981. – С. 34–48.

2. *Пасэ, У. С.* Віцебская настаўніцкая семінарыя / У. С. Пасэ // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1994. – Т. 2: Беліцк-Гімн / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 326.

3. Сборник постановлений по Министерству народного просвещения. – 2-е изд. – СПб.: Тип. В. С. Балашева, 1875–1876. – Т. 1: Царствование императора Александра I 1802–1825 гг. – 1875. – 1864 стб., 43 с., 44 стб.; Т. 2. Отд. 1: Царствование императора Николая I 1825–1839 гг. – 1875. – 1576 стб., 69 с., 54 стб.; Т. 2. Отд. 2: Царствование императора Николая I 1840–1855 гг. – 1876. – 1648 стб., 107 с., 58 стб.; Т. 3: Царствование императора Александра II 1855–1864. – 1876. – 1528 стб., 140 с., 48 стб.

4. Сборник распоряжений по Министерству народного просвещения: в 10 т. – СПб.: Тип. Императорской Академии наук, 1866–1907. – Т. 1: 1802–1834. – 1866. – 988 стб., 43 с., 32 стб.; Т. 2: 1835–1849. – 1866. – 1102 стб., 74 с., 58 стб.; Т. 3: 1850–1864. – 1867. – VI с., 1068 стб., 124 с., 50 стб.

5. Сборник материалов для истории просвещения в России, извлечённых из архива Министерства народного просвещения: в 4 т. – СПб.: 1893–1902. – Т. 2: Учебные заведения в западных губерниях 1802–1804 / введение И. Корнилова. – СПб.: Синодальная тип., 1897. – XXVII, XCVI с., 1160 стб.

6. *Bieliński, J.* Uniwersytet Wileński 1579–1831: w 3 t. / J. Bieliński. – Kraków: Druk Anczyca i Spółki, 1899–1900. – T. 1: Prawa. Urządzenia zewnętrzne. Majątek. – 1899. – 486 s.

7. Сборник материалов для истории просвещения в России, извлечённых из архива Министерства народного просвещения: в 4 т. – СПб.: 1893–1902. – Т. 4. Вып. 1 / предисловие А. Погодина Виленский учебный округ 1803–1831 гг. – СПб.: Тип. П. П. Сойкина, 1902. – IV, CXXXIII с., 432 стб.

8. *Поссе, В. С.* Просвещение в Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в.: дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / В. С. Поссе. – Минск, 1963. – XXI, 385, X л.

9. *Bartnicka, K.* Działalność edukacyjna Jana śniadeckiego / K. Bartnicka. – Wrocław etc.: wyd. Polskiej akademii nauk, 1980. – 445 s.

10. *Beauvois, D.* Wilno – polska stolica kulturalna zaboru Rosyjskiego 1803–1832 / D. Beauvois. – Wroclaw: Wydawnictwo Uniwersytetu Wroclawskiego, 2012. – 824 s., il.

11. Об утверждении положения и штата учреждаемой при Виленском университете семинарии для образования приходских учителей и органистов: высочайше утверждённое 9.07.1819 г. мнение Государственного Совета, опубликованное Сенатом 31.08.1819 г. // Полное собрание законов Российской империи: собрание 1-е с 1649 по 12 декабря 1825 г.: в 45 т. – СПб.: Типография 2-го отделения собственной его императорского величества канцелярии, 1830. (ПСЗ-1). – Т. 36. – № 27875. – С. 278–280.

12. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 3157. Воп. 1. Спр. 173.

13. *Rewkowski, Z.* Pamiętniki / Z. Rewkowski; z oryginału do druku przygotował, wstąpem i przypisami opatrzył Witold Więsław. – Wrocław: Instytut Matematyczny Uniwersytetu Wrocławskiego, 2011. – T. 1: Wilno. Ostatnie lata Uniwersytetu. Na prawach rękopisu. – 187 s.

14. Журнал Министерства народного просвещения. – 1834.

15. Журнал Министерства народного просвещения. – 1835.

16. *Сапунов, А.* Историческая записка 75-летия Витебской гимназии / А. Сапунов. – Витебск: Типография губернского правления, 1884. – 167, CLXXVII с.

17. НГАБ. – Ф. 2554. Воп. 1. Спр. 29.

18. *Григорьев, В. В.* Императорский Санкт-Петебургский университет в течение первых пятидесяти лет его существования. Историческая записка / В. В. Григорьев. – СПб.: Тип. В. Безобразова и Ко, 1870. – 679 с. разд. паг.

19. Акт двадцатипятилетнего юбилея Главного педагогического института 30 сентября 1853 г. – СПб.: Тип. императорской Академии наук, 1853. – [2], 14, II, 176, 4 с.

**(Дата падачы: 24.02.2023 г.)**

*А. Л. Зянько*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск

*L. Zianko*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 94:379.85(476)"18/19"**

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ СТАНАЎЛЕННЯ ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

# SOCIO-ECONOMIC PREREQUISITES OF THE ORIGINATION OF EXCURSION ACTIVITIES IN THE BELARUSIAN LANDS IN THE SECOND HALF OF THE XIX - EARLY XX CENTURY

*Артыкул прысвечаны аналізу перадумоў узнікнення турыстычнай дзейнасці на тэрыторыі беларускіх губерняў у другой палове XIX – пачатку XX ст. Паказана роля эканамічных, сацыяльных і культурных змен, што адбываліся ў Беларусі ў дадзены час, у працэсе фарміравання турызму як асобнага віду дзейнасці.*

*Ключавыя словы: турызм; падарожжа; мадэрнізацыя; урбанізацыя; транспарт; інфраструктура; сярэдні клас; вольны час; арганізаваны адпачынак.*